# Драпежныя птушкі



Птушыныя драпежнікі - самыя бязьлітасныя і майстэрскія паляўнічыя птушынага сьвету. Сваімі выгнутымі кіпцюрамі і дзюбамі гэтыя зоркія паветраныя асы выпроставаюцца за самай разнастайнай здабычай.




Драпежныя птушкі
Здыхлятнікі, ці сьцярвятнікі
Птушкі, што кормяцца жывой здабычай
Дзённыя драпежныя птушкі
Начныя драпежныя птушкі

Драпежныя птушкі- гэта птушкі сярэдняй і буйнай велічыні. У аднаго з самых буйных відаў - амерыканскага кондара - крыло даўжынёй каля 115 см, размах крылаў да 275 см. Самыя дробныя драпежныя птушкі - так званыя карлікавыя сокалы - маюць крыло даўжынёй 9-10 см.





Большасць дзённых драпежных птушак адносяцца да атрада сокалавобразных

- Каршаковыя
- Скапіныя
- Сакратары (у Беларусі няма прадстаўнікоў)
- Сакаліныя

Начныя драпежныя птушкі прадстаўлены прадстаўнікамі атрада совавобразных











# Сакаліныя







**Сокал-падарожнік (сапсан)** Буйны сокал (даўжыня цела 42-50 см, маса да 1,3 кг) з вострымі крыламі, размах якіх каля метра, і доўгім клінападобным хвастом.

У Беларусі занесены ў Чырвоную кнігу. Корміцца галубамі, качкамі, цецерукамі, кулікамі, варонамі, сарокамі, сойкамі і інш. Перад тым як напасьці, сапсан рэзка ўзьнімаецца ўгару, затым, склаўшы крылы, кідаецца ўніз, разьвіваючы пры гэтым хуткасць да 75 км у гадзіну. Здабычу б'е кіпцюрамі задніх пальцаў, вострых і крывых, як турэцкі ятаган. Часам хуткасць, якую разьвівае сапсан у палёце можа дасягнуць 300 км у гадзіну.





**Сокал-пустальга**

Аснову сілкавання складаюць грызуны, радзей мелкіі вераб'іныя птушкі, рэптыліі. Палюючы, часта завісае на месцы ў паветры, дробна трапечучы крыламі. За гэту асаблівасьць пустальга атрымала народную назву «трасца». Заўважыўшы мыш ці буйное насякомае, яна імкліва валіцца ўніз. За дзень дарослая пустальга з'ядае каля дзясятка грызуноў.

Вастрыня зроку звычайнай пустальгі вышэй чалавечай у 2,6 разу. Чалавек з такім зрокам мог бы прачытаць усю табліцу для праверкі зроку з адлегласці 90 метраў.







# Каршаковыя

*Шуляк-галубятнік.* Буйны, большы за варону драпежнік. Здабычу ловіць, вылятаючы з засады. Кароткія крылы і доўгі хвост дазваляюць каршаку майстэрскі лавіраваць паміж дрэвамі, хутка змяняць кірунак, рэзка тармазіць і паскарацца. Сілкуецца рознымі птушкамі і млекакормячымі памерам аж да зайца.

Трымаюцца сваёй тэрыторыі. Калі хто-небудзь урываецца на іх тэрыторыю, пара адчайна будзе яе абараняць.

Як і іншыя каршакі, маюць зносіны паміж сабой пасродкам гукавых сігналаў, выдаючы высокі звонкі клёкат.





**Шуляк-карагольчык.** Уяўляе сабою мініяцюрную копію шуляка-галубятніка. Распаўсюджаны ў Беларусі.

Засяляе лясы розных тыпаў, суцэльных лясоў пазьбягае, аддаючы перавагу ўзлескам, гаям, пасекам, рачным далінам, культурным ландшафтам. Нярэдка сустракаецца ў населеных пунктах, асабліва ўзімку.

Сілкуецца амаль выключна дробнымі вераб'інымі птушкамі, самкі могуць нападаць на галубоў, соек, маладых рабчыкаў. Значна радзей палюе на дробных грызуноў. Здабычу, як і галубятнік, падцікоўвае ў засадзе.





Арлы - буйныя і сярэдняй велічыні птушкі. Для іх характэрна апярэньне ног да самых пальцаў.



**Арол-вужаед.** Сваё імя атрымаў, бо харчуецца выключна змеямі, яшчаркамі, зрэдку жабамі і рапухамі



**Вялікі арлец.** Жыве ў Беларусі пераважна ў паўднёвай частцы. Любіць Палескія балоты



**Малы арлец.** Адзін з самый распаўсюджаных беларускіх арлоў

**Луні** - насельнікі адкрытых прастор. Выглядваючы здабычу, луні ляцяць нізка над зямлёй, павольна махаючы крыламі і зьдзяйсняючы кругавыя аблёты. Гняздуецца і адпачывае на зямлі.




Лунь палявы




Лунь балотны




Лунь паплаўны

**Арол-маркут (беркут)** — адна з найболей вядомых драпежных птушак сямейства каршаковых, самы буйны арол. Распаўсюджаны ў паўночным паўшар'і, дзе жыве пераважна ў гарах, у меншай ступені на раўнінах. Пазьбягае жылых раёнаў.

У казахаў, кіргізаў і манголаў, беркут выкарыстоўваецца ў якасьці лоўчай птушкі для паляваньня на лісіц-карсакоў, зайцаў, часам ваўкоў, сайгакаў і джэйранаў.

У Беларусі распаўсюджана ў Віцебскай вобласьці. На Паазер'і.





**Арлан- белахвост.** Самая буйная з драпежных птушак, якія гняздуюцца ў Беларусі. Даўжыня цела 80-98 см, маса да 6,5 кг, размах крылаў да 2-2,4 м. Большасць месцаў гнездаваньня прымеркавана да раёнаў Беларускага Паазер'я. Любіць старыя лясы, у асноўным бары, зарослыя высечкі з асобнымі дрэвамі пасярод іх, зрэдку ўскраіны балот паблізу буйных азёр і рыбагадоўчых гаспадарак .

Гэта птушка з’яўляецца сымбалем ЗША





Ежа **каршака** разнастайная: у стэпах і <u>палях</u> ён ловіць грызуноў, птушанят розных птушак, яшчарак; у поймах рэк – качанят, птушанят крачак; у населеных пунктах – куранятаў.






**Чырвоны каршак.** Засяляе старые лісцяныя і зьмяшаныя лясы, бары, што побач з адкрытымі ландшафтамі і вадаёмамі. Гняздуецца асобнымі парамі. Сілкуецца падальлю і грызунамі



Сустракаецца **чорны каршак** паўсюдна, за выключэньнем тундры і паўночнай тайгі. Гняздуецца на высокіх дрэвах, майструючы буйныя гнёзды, будаўнічы матэрыял якіх увесь час абнаўляецца. Характэрная рыса гнязда каршака – наяўнасць у іх ануч, кавалкаў газеты, папяросных скрынак.





# Скапіныя

Асноўная ежа **скапы** — рыба сярэдняй велічыні. Аднак у выпадку адсутнасьці ці малой колькасці рыбы корміцца дробнымі грызунамі, жабамі, зрэдку птушкамі. Здабывае рыбу вельмі своеасабліва. Скапа лётае на вышыні 20—25 м. над вадаёмам. Згледзеўшы здабычу, складае крылы і, выцягнуўшы лапы, кідаецца ў ваду, часам пры гэтым цалкам у яе апускаючыся. Рыбу ў залежнасці ад велічыні захоплівае ці дзвюма лапамі, ці адной. Хоць, скапа корміцца і карыснымі рыбамі, шкоднай для рыбнай гаспадаркі яе лічыць не варта, бо птушка гэта рэдкая і малалікая. У шматлікіх краінах скапа ахоўваецца як цікавы помнік прыроды.





# Сакратары (у Беларусі няма прадстаўнікоў)

Рост **птушкі-сакратара** налічвае ад 125 да 150 мм, а вага дасягае амаль 4 кг. Размах крылаў складае прыкладна 210 мм. Яе своеасаблівае імя паходзіць ад чорных пёраў на галаве, якія нагадваюць гусіныя пёры, якія раней любілі ўстаўляць у свае парыкі судовыя сакратары. Афарбоўка іх апярэньня на шыі і жываце шэрая і становіцца цямней па меры набліжэння да хваста. Вакол вачэй і да дзюбы апярэньня няма і бачная аранжавая скура.



Сцярвятнікі або здыхлятнікі.
У Беларусі не сустракаюцца

Сьцярвятнікі сілкуюцца трупамі загінулых жывёл. У іх голыя ці з рэдкім апярэньнем галава і шыя; магутная дзюба, загнутая ўніз; шырокія крылы, ногі з тупымі кіпцюрамі.



# Грыф і сіп



# Совы (начныя драпежнікі)

Даўжыня цела у **совападобных** да 84 см, размах крылаў да 2 м, маса да 4,5 кг. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне мяккае, рыхлае, шараватае, бурае або рыжаватае, з цёмнымі і светлымі плямамі і стракацінамі. Твар акруглы. З органаў пачуццяў найбольш развіты слых і зрок. Вочы вялікія, у арбітах нерухомыя. У многіх відаў на галаве «вушкі» з падоўжаных пёраў (відавая адзнака). Крылы шырокія, закругленыя, хвост adносна кароткі. Дзюба вострая, кароткая, крута загнутая ... ія, чатырохпальцыя Цэўкі ўкарочаныя, апераныя, кі ...
Гняздуюцца на зямлі, у ду ... ах іншых птушак, расколінах скал, збудаваннях. Больш ... лююць выключна ноччу або ў прыцемках



# У Беларусі распаўсюджаны



Барадатая кугакаўка



Вераб'іны сыч



Балотная сава



Пугач



Соўка- сплюшка



Вушастая сава